Ба 53252

С. ЗНАЁМЫ

# ВІДАГОРШЧЫ

ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ
ЎДЗЕЛЬНІКА ЧЫРВОНААРМЕЙСКАГА
АГРАПАХОДУ

Книжная палата
qazaqstan
kitap palatasy

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

№ 8162
25. 04. 2009

Заказ № 601. 5.000 экз. ($1^{1}/_{4}$ арк.). Галоўлітбел № 1669.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

## Колёны ідуць

Сёньня жыцьцё Менску пачалося раней звычайнага. Досьвіткам затрубіў гарністы. Тру-ту-ту! Тру-ту-ту!..

У чырвонаармейскіх казармах заварушыліся. Хутка, па-чырвонаармейскаму апрануліся, памыліся. Сьнеданьне і—паход. Той самы паход, да якога доўгі час старанна рыхтаваліся кожны чырвонаармеец, кожны камандзір, кожны політпрацаўнік. Той самы паход, мэта якога дапамагчы партыі ды ўладзе ў колектывізацыі вёскі, дапамагчы колгасам у падрыхтоўцы да сапраўднай бальшавіцкай вясны.

Крануліся. У сьвежым паветры трацяцца гукі оркестры. Скрыпіць пад нагамі сьвежы сьняжок. Тарарахкаюць двуколкі, колы гармат. Віхрасты ветрык круціць сьнег, а мароз-абібока шчыпле за вушы.

БА53252 бр

— Левай, левай!..—чуваць час-часам каманда. Стройнымі радамі крочаць чырвонаармейцы.

А ззаду стройных радоў рухаюцца адзін за адным з кузьнечнымі, сталярнымі, сьлясарнымі прыладамі вазы, двуколкі з літаратурай і плякатамі.

— Левай, левай!..—уторыць камандзір, і ў тахт яго голасу скрыпіць пад нагамі чырвонаармейцаў сьнег.

— Лыс,—зьвяртаецца, седзячы на двуколцы, чырвонаармеец да суседа,—ты тую кніжачку „За колгасы“ ўзяў?

— Узяў.

— Гэта добра.

— А прачытаныя кніжкі таксама ўзяў?

— Пэўна.

— Гэта дужа добра, ведаеш, у вёсцы спатрэбіцца. Для сялян гэта будзе навіной.

...Зноў той самы голас „левай“, зноў гукі оркестры, скрып сьнегу пад палазамі санак, зноў мілагучная песьня ветрыку...

Ідуць моцныя чырвонаармейскія колёны. Коні апрануліся ў белую зімовую



23. II 4. 2009

вопратку. Мінулі менскія доўгія вуліцы, даўно пяройдзены акраіны, хутка раёны. Хутка пакажуцца сялянскія хаткі. Хутка прывал і пачатак тэй работы, да якой так старанна, так напружана рыхтаваліся.

## Старшыня спалохаўся

Сьнег. Мяцеліца. Круціць. Мяце. Вые вецер-злодзей, кідаючы сьнежныя грудкі ў твар. Гудуць тэлеграфныя правады. Менск даўно ззаду. Сьцюдзёна. Едзем.

Першы прыпынак у вёсцы Новасёлкі. Тут разьмясьцілася частка чырвонаармейцаў палкавой школы. Хлопцы ўмарыліся, але за работу ўзяліся. Глядзіш, то ў аднэй, то ў другой хатцы, схіліўшыся над брошурай ці газэтай, чырвонаармейцы чытаюць сялянам апошнія навіны, апавядаюць пра дзеяньні Далёка-Ўсходняй арміі, чытаюць лісты, надасланыя бацькамі, увайшоўшымі ў колгас.

Вось сялянка Арына. Яна пазірае на чырвонаармейцаў з асьцярогай. Ёй шэсьцьдзесят год. Усіх сыноў пажаніла, а цяпер:

— І памерці ня страшна,—кажа яна,— толькі вось хацела-б пажыць гадок-другі ў колгасе, пабачыць як там будзе жыць.

Рослы чырвонаармеец з Магілеўшчыны гаворыць Арыне пра колгас. Бацька яго ў колгасе імя газэты „Рабочий“.

— І сам, як толькі адслужуся, пайду ў колгас,—кажа магілевец.

Глядзіць Арына яму ў вочы, шаволіць бабуля губамі, нібы сказаць нешта хоча. Хвіліна і яна сказала. Ня вытрымала.

— Скажы, сынку, чаго вы да нас прыехалі, ці ня ўсіх у колгасы сілком гнаць?

— А хто-ж гэта вам, бабка, так гаварыў?

— Суседзі... А хто, кажуць, ня пойдзе, таго за мора адашлюць.

— Праўда, бабка, не мяшала-б вашых суседзяў за такія чуткі выправіць за мора. Брэшуць яны.—І ён пачаў апавядаць сабраўшайся вакол бабкі сям‘і аб мэтах аграпаходу.

З нейкай асаблівай увагай слухалі яны гэтае простае тлумачэньне,—сына і брата свайго—селяніна. І калі магілевец

скончыў, бабуля адкрыла печ, дастала адтуль гаршкі і, наліўшы ў міскі капусты і крупені, запрасіла чырвонаармейцаў палуднаваць. Але яны адмовіліся.

— Дзякуем вам, дужа дзякуем,—гаварылі чырвонаармейцы, ідучы з кацялкамі на кухню.

*
* *

Мы едзем. Машына лёгка расьсякае вялікія гурбы сьнегу. Хрыпяць, зварочваючы з дарогі, сялянскія коні. Паважна паварачваецца, седзячы поплеч са мной, начальнік опэрацыйнай часткі N-скай стралковай дывізіі тав. Сальнікаў. Вецер дзьме яму проста ў твар. Ну, і вецер. Ах, якое дрэннае адчуваньне нясе кожная хваля гэтага сіверу. Ён залазіць пад вопратку. Гуляе па целе. Сьцюдзёна. Нават тав. Глебаву, начоргчасьці падыва, які сядзіць поплеч з шофэрам, холадна.

— Сьцюдзёна,—кажа ён.

— Нічога, гэта бяз прывычкі,—нацягваючы на ногі коўдру, кажа таварыш Сальнікаў.

Яшчэ некалькі хвілін, і мы ў вёсцы Паперня. Тут чырвонаармейцы пасьпелі адпачыць і шмат чаго зрабіць. Яны падрыхтавалі да рамонту трыеры, адрамантавалі „Трыумф“. Прывялі да парадку памяшканьне сельсавету. Са звонкім сьмехам, з вясёласьцю, з бадзёрым настроем брыгады сталяроў рамантавалі школу. Хутка ішла работа. А на дварэ гуў вецер, рассыпаючы сыпкі, пухкі сьнег.

Папярнянскі сельсавет, гэта адзін з тых сельсаветаў Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, дзе правесьці якое-небудзь мерапрыемства было надзвычайна цяжка, а часам і немагчыма. Сялянства гэтага сельсавету ў большасьці сваёй складаецца з серадлякоў і значнага процанту кулацтва. Апошнія жылі ціха. Іх мясцовая ўлада не чапала. Некаторыя з кулакоў былі індывідуальна не абкладзены. Былая памешчыца Макоўская, цяпер кулачка, жыла як „у Хрыста за пазухай“. Сельсавет баяўся яе чапаць.

РВК згуртаваў брыгады па раскулачваньні. Адна з гэтых брыгад прыехала

ў Папярнянскі сельсавет, але да гэтай важнай работы не прыцягнула батрацка-бядняцкія масы, не парупілася арганізаваць колгасы, а правяла раскулачваньне адміністрацыйным парадкам, бяз мас.

А сельсавет, той дык зусім спалохаўся. Ён ня змог стаць на чале кіраўніцтва па раскулачваньні. Старшыня сельсавету Давыдаў так перапалохаўся, што нават і цяпер баіцца заходзіць у сельсавет. Абыходзіць яго. Але-ж затое бяз жаднага страху, сьмела заходзіць да кулакоў пагутарыць, чарку выпіць.

Зьвіняць у школе пілы, стукаюць малаткі, гутарка і песьні ліюцца. Позна вечарам выехалі мы з Паперні. Ноч. Машына скача з гурбы ў гурбу. Мяце. Цёмна. Вецер гудзе, дрэвы гне да долу, рукі мерзнуць, а ехаць трэба...

## Змаганьне за колгас

Гэта ноч была ночай невялікіх парашкод і няўдач. З вялікімі труднасьцямі нам удалося прыехаць у Вішнёўку. Тры

разы зарываўся ў гурбах наш „Форд“, тры разы нам прыходзілася выцягваць яго з сьнегавых гор і нарэшце—саўгас Вішнёўка.

У клюбе саўгасу пад гармонік чырвонаармейца Пятрова, саўгаскія дзяўчаты і хлопцы разам з чырвонаармейцамі танцавалі вальс. А ў чытальні старыя саўгасьнікі гулялі з чырвонаармейцамі ў шашкі.

Саўгас Вішнёўка—гэта адзін з перадавых саўгасаў у раёне. Заснаваўся ён у 1921 г. Стаж існаваньня вялікі. Першыя гады саўгасаўцы ўспамінаюць уздыхаючы.

— Усяго было,—кажа старая саўгасьніца з Горадзеншчыны.—І еўшы былі, а больш усяго ня еўшы. Цяжка было. А потым...

А потым справы саўгасу пачалі паляпшацца. І цяпер ён зьяўляецца прыкладам для ўсіх ваколічных вёсак. Мае ён 24 кані, 54 галавы быдла, 190 *га* зямлі. Тры гады таму назад саўгас перастаў быць для дзяржавы дэфіцытным, тры

гады, як ён дае дзяржаве прыбытак. Работа ў саўгасе наладжана добра. Усё робіцца паводле пляну, сваячасова. Машыны ўсе адрамантаваны, дагледжаны, упарадчаны.

Ад саўгасаўцаў мы даведаліся, што ў вёсцы Бычкі адбудзецца сялянскі сход. Жаданьне пабыць на ім прымусіла нас пайсьці ў Бычкі.

Дарога была зусім замецена сьнегам. Ледзь выцягнем адну нагу з сьнегу, як схаваецца другая. Мокрымі прыйшлі ў Бычкі. І, на вялікі жаль, сходу ня было. Яго перанесьлі ў пасёлак Кругліцы.

— Што-ж, ідзем далей?—кінуў ветру ў зубы т. Глебаў.

Мы пайшлі. Уперадзе ішоў тав. Сальнікаў, за ім—я. Далёка адстаўшы ад нас,—Глебаў.

— Ці далёка?—пытаўся, наганяючы нас Глебаў.

— Не, не асабліва.

— А адкуль-жа вы ведаеце?—пацікавіўся я.

— Як, адкуль?—сказаў т. Сальнікаў.— Ды я-ж гэту мясцовасьць як сваіх пяць пальцаў ведаю. Я-ж яе ў 1920 г. усю выхадзіў, наша часьць выбівала адсюль палякаў.

— Вось яно што!

— То-ж бо браточку!

Праз галіны дрэў, апранутых у сьнег, заблішчэў агенчык. Пайшлі на яго. Гэта быў пасёлак Кругліцы.

У школе холадна. Сядзелі тры барадатыя селяніна. А адзінаццатай гадзіне прыйшло яшчэ некалькі чалавек.

— Відаць, нічога ня будзе,—сказаў адзін з увайшоўшых. Яму ніхто не адказаў. Праз хвілін пятнаццаць школа была паўнюткая.

Сход пачаўся.

Дакладчык гаварыў каротка, але-ж дужа крычаў. Гаварыў пра колгаснае будаўніцтва. Гаварыў аб патрэбе арганізаваць колгас.

Скончыў.

— У каго ёсьць пытаньні?

Цішыня. Маўчаньне. Яшчэ раз запытаўся. Зноў маўчаньне.

— Хто хоча выступіць у спрэчках?

Ані гуку. Галовы апусьціліся. Душна. Нават ніхто не закурвае. Чакаюць. Напружанасьць. І так у працягу трыццаці хвілін. Цішыня.

Тады ўстаў тав. Глебаў. Усе зьвярнулі на яго ўвагу.

— Значыцца, усё зразумела?

Цішыня.

— Тады дазвольце спытацца ў вас,— казаў далей тав. Глебаў.—Мне вось не зразумела, што будзе ў колгасе са старымі, страціўшымі працаздольнасьць?

— Ня ведаем!

— А ці можна будзе колгасьніку мець курэй, шафу, ложак?

— Ня ведаем!

— Тады я прапаную чытаць статут колгасу.

— Чытайце, паслухаем!

Закурылі. Сталі гаманіць пакрысе. Пачалося чытаньне статуту. Кожны пункт тлумачыў Глебаў. Скончылася чытаньне.

Лёгка ўздыхнулі сяляне. Заварушыліся. Загутарылі.

— Дык вось яно што, вось што абазначае колгас —І адзін за адным падыходзілі яны да стала, запісваліся. Усе бычкоўцы і круглянцы запісаліся ў колгас. Тут-жа абралі пяцёрку па аграмаджэньні збожжа і жывёлы. Назаўтра нам перадавалі, што пяцёрка ўзялася за работу.

*
* *

Кулак сьцішыўся. Але—„у ціхім балоце чэрці водзяцца“. Кулак супакоіўся. Так здаецца на першы погляд. А пагля дзець глыбей,—другія, іншыя малюнкі паўстаюць перад вачыма. Малюнкі сьмяртэльнага клясавага змаганьня. Кулак ня сьцішыўся. Не. Кулак бачыць свой канец, зыходзіць з дарогі, гнецца пад моцнымі ўдарамі батрацтва і беднаты, зьнішчаецца як кляса, але, пакідаючы сьвет жывых, вялікае соцыялістычнае будаўніцтва, кулак шкодзіць. Ён актывізуецца, зьмяніўшы тактыку, зьмяніўшы формы і мэтоды свайго дзеяньня. Па-

новаму, па-свойму, па-кулацкаму змагаецца цяпер кулак. Ён вядзе ўпартае змаганьне за колгас, за аўладаньне колгасам.

Конь спыніўся і мы ўвайшлі ў добра абсталяваную хату кулака вёскі Галіца. На ўслоне плакала кабета год пад сорак.

— Чаго-ж ты, цётка, плачаш? — пыталіся мы.—Што, мабыць, у колгас ня хочаш ісьці?

— А няўжо цяпер плача той, хто ў колгас ісьці ня хоча? Не, мае родненькія, цяпер плача той, каго ня прымаюць у колгас!

Шмат кулакоў хочуць пралезьці ў колгас, разбазарваюць сваю маемасьць, уцякаюць у другія раёны. Шмат каму з іх такім чынам удалося пралезьці ў колгасы. Самавольнае перасяленьне было забаронена. Тады кулакі пайшлі на другія хітрыкі. Прадстаўніком апошняй групы кулакоў зьяўляецца кулак Азаронак. Ён і ня думаў спраўляць маемасьць, не, наадварот, ён купляе маемасьць тых, хто яе прадае. Так, ён купіў 500 пудоў канюшыны, чацьвертага каня, восьмую ка-

рову. І ўсё гэта зрабіў, каб давесьці ўладзе, што ён ня супроць калгасу, што ён хоць сёньня гатоў у колгас. Гатоў аддаць дарэмна колгасу ўсю сваю маемасьць, толькі:

— Будзьце ласкавы, таварыш старшыня, запішэце мяне ў колгас,—просіць Азаронак старшыню сельсавету.

Так змаганьне за колгас разгараецца. Беднякі, батракі і серадлякі ахвотна ідуць у колгас. А кулак пярэчыць. На сходзе ён выступае за колгас, а дома, у суседа, у знаёмых агітуе супроць колгасу. Дый ня толькі адно кулацтва супроць колгаснага руху. Папы і ксяндзы, рабіны па мястэчках, пры першай магчымасьці, стараюцца сарваць мерапрыемствы партыі ды ўлады па соцыялістычнай перабудове вёскі.

Поп Аколіца-Халяўскага прыходу Паўскі вечарамі ходзіць па хатах беднякоў і ціхенька гаворыць, навучае „непросвещенный народ“.

— Згінеце вы ў колгасе, як рудыя мышы. Грэшыце вы, веручыя, перад

госпадам богам, ідучы ў колгас. Пакарае вас магутны ўсевышні за гэта.

І, разам з гэтай контр-рэволюцыйнай пропагандай, разносіць па беднякох свае залатыя рэчы, каб схаваць іх ад „страшэннай буры—колектывізацыі".

Мала таго, што Паўскі сам ходзіць па хатах, ён яшчэ выпраўляе па ваколічных вёсках жабракоў. Яны гэтыя жывыя батлейкі перапяваюць папоўскую песьню. Пад выглядам членаў тых колгасаў, што развалілся, яны агітуюць батракоў:

— Ня ідзеце ў колгас, там ня жыцьцё, а пакута. Ня ідзеце ў колгас, калі хочаце жыць. Лепш з торбай пайсьці. Лепш у лес пайсьці, як у колгас.

Вось яна папоўская дзейнасьць! Але Паўскага выкрылі. Схаваў ён у бяднячкі Вольскай на 250 руб. залатых рэчаў. Муж Вольскай, даведаўшыся пра схаваныя рэчы, сказаў старшыні сельсавету, а той хлопец маху ня дасьць. Рэчы ў Вольскай апісалі. Яна да папа, а поп: „Не мае,—кажа рэчы, ды і ўсё. знаць ня знаю, ведаць ня ведаю". Разгнева-

Книжная палата
9°za
Kytab palatasy

лася Вольская. Разгневаліся і другія беднякі, у каго былі таксама пахаваны папоўскія рэчы. Зьнесьлі ўсе гэтыя рэчы на сход, а потым, калі крыху спала злосьць на папа, калі крыху супакоіліся, сход пачаўся. Гаварылі мала, гаварылі проста і нарэшце—пастанова:

— Царкву адабраць пад колгаскі дом культуры. Прасіць РВК, каб папа выселіў за межы нашага раёну.

Адалей—слова за слова, адзін за адным, падбухтораныя чырвонаармейцамі, халяўцы ў колгас запісаліся. 110 двароў. Вялікі колгас. Раніцай за аграмаджаньне маемасьці ўзяліся. Работа закіпела.

Вішнёўку мы пакінулі ўдзень. Наладзіўшы там насьценгазэту і азнаёміўшыся з работай саўгасу, мы накіраваліся ў Відагоршчы—комсамольскую комуну. Там быў галоўны раён дзейнасьці часьцей Чырвонай арміі. Там працавалі чырвонаармейскія брыгады.

Пра гэту комуну нам гаварылі многа. Гаварылі пра тое, што комуна зьяўляецца тормазам у справе правядзеньня колек-

тывізацыі ў ваколічных вёсках. Казалі, што комуна раскідаецца.

Праўда гэта, ці не,—ці ў такім стане знаходзіцца комуна? Вось пытаньні, якія паўсталі перад намі ва ўсю веліч, якія прымусілі нас хутчэй варушыцца, каб пабачыць, азнаёміцца з Відагоршчамі.

## Відагоршчы

Ад сьнегу зьвісае гальлё елак. Ветрык гойдае іх. Сад—сьнегам цьвіце. Сажалка з карасямі сьпіць пад зімоваю коўдрай. Белая, пухкая, мяккая вата ляціць з вышыні.

Праехаўшы прысады, мы спыніліся ля першага будынку Відагоршч — вялізнай пуні. Увайшлі. Машыны, трыеры, драпакі, арфы, саломарэзкі пераблыталіся жалезнымі часткамі. Ляжаць заіржавелыя, паламаныя. Тут-жа салома. Збожжа ляжыць пад дзіравай страхой, вераб'і клююць зерне.

Але на правым баку пуні працуюць чырвонаармейскія брыгады. Хтосьці на-

сыпае ў мяхі авёс для адпраўкі на сартоўку ў Астрашыцкі Гарадок. Хтосьці перацягвае машыны. Шурхаціць салома, якую пераносяць на другі бок пуні. Узьнімаюць пыл мётлы. Весела. Чырвонаармейцы гутараць, сьмяюцца. Машыны рамантуюць, сьцягваюць іх у куток, парадкуюць.

— Нічога, да вечара ўсё зробім палюдзку,—кажа тав. Арлоў—камісар аграпаходу.

* * *

Начальнік сувязі N-скай стралковай дывізіі прыехаў у Відагоршчы з брыгадай кавалёў за дзень да прыходу часьці. Брыгада пад яго кіраўніцтвам добра направіла кузьню, набыла патрэбную кольказсьць вугальля.

Мы зайшлі ў кузьню ў самы час работы. Стукалі малаткі і малаточкі, сыпаліся іскры агню. А белыя языкі полымя лізалі чырвоную сталь лемяхоў.

— І як табе ня сорам,—кажа начальнік сувязі маладому кавалю, які зламаў

у плузе ручку.—Ну, ня стой. Паламаў— папраў.

І сам падбег да горана, схапіў з агню чырвоны лемех і пачаў каваць. Жвава ішла ў яго руках работа. Скончыў лемех, узяўся літаваць абцугі, а калі зрабіў і гэта, прыцэліўся на просвы.

Работы многа, а часу мала. Трэба сьпяшацца, трэба пасьпець направіць паламаныя машыны, падрыхтаваць іх да вясны. Ня ісьці-ж комунарам вясной на поле з голымі рукамі. Сяляне будуць сьмяяцца. А каваль комуны ня рупіцца аб машынах. Ён толькі і ведае, што піць. Атрымае грошы—прап'е. А потым зойдзе на кухню, забярэцца ў стружкі ды сьпіць бяз просыпу цэлы дзень. Так і бадзяецца да чарговай пэнсіі, а машыны комуны іржавеюць і ламаюцца.

Каваль комуны, гэта жывы экспонат тых абібокаў-комунараў, якія прывялі комуну да дрэннага становішча. Шмат хто з былых комунараў сядзіць цяпер у „доме адпачынку“—допры, а комуна

гэтым часам, пры дапамозе адпаведных організацый, наладжвае свае справы.

А было. Платы, нібы п'яныя, хіліліся ад ветру. Стрэхі пунь і хлявоў глядзелі ў неба чорнымі вачыма-дзіркамі. Кузьня была пахілілася, вось-вось заваліцца, млын быў замкнёны.

А цяпер? Мінулі цяжкія часы для комуны. Комуна страпянулася. Комуна абнавілася новымі людзьмі. Новыя людзі прынесьлі ў комуну сьвежае, жывое паветра. Ажывілі работу комсамольскай ячэйкі. Комунары па-новаму, як належыць, па-комуністычнаму пачалі працаваць. Добра, па-гаспадарску даглядаюць коняй, кароў. Дзяўчаты па начох ня сьпяць, даглядаючы цельных кароў. Народзіцца цяля, яны забіраюць яго ў асобны пакой—„цялячая консультацыя", і там поюць яго малаком, накрываюць коўдрамі.

А хлопцы будуюць вялікія пляны. Комуне адпусьцілі 500 пнёў лесу. Трэба яго скарыстаць, і яны надумаліся будаваць лазьню і клюб.

— Як толькі крыху справімся з вывазам бярвеньня, так і пачнем будаваць,— кажа Мікола А.—былы бяспрытульны, верхавод шайкі налётчыкаў на менскія рынкі.

А такіх як Мікола тут не адзін. Цяжка было ім прызвычаіцца да працоўнага жыцьця. Некаторыя ня вытрымалі, уцяклі. А большасьць прызвычаілася. І цяпер яны нядрэнныя комунары, нядрэнныя будаўнікі новага колектыўнага жыцьця.

Мікола павёў нас у хлеў, дзе знахадзіліся сьвіньні. Там было душна, паветра цяжкое.

— Сьвіньням тут дрэнна, - кажа камандзір аграпаходу тав. Мыгла.—Трэба зрабіць акно ў страсе для ачышчэньня паветра.

І ён зараз-жа павёў чырвонаармейцаў, паказаў ім дзе і як рабіць „вэнтылятар“.

— А якія-ж да вас адносіны саўгаснікаў з Вішнёўкі?—пацікавіўся чырвонаармеец Сацункевіч.

— Дрэнныя, яны ня любяць нас, кажуць, што мы працаваць ня ўмеем. Яны

не дапамагаюць нам. Нават сёньня адмовіліся даць мяхі, каб адвезьці збожжа на ачыстку.

Увечары быў скліка્ны агульны сход саўгасьнікаў Вішнёўкі з комунарамі Відагоршчы. Проста, па-сяброўску, габарылі яны між сабой. Саўгасьнікі прызналіся, што сапраўды мала дапамагалі комунарам, кпілі, сьмяяліся з іх. Саўгасьнікі тут-жа на сходзе абяцаліся дапамагчы комуне ў рабоце, дапамагчы комуне, да якой, ня гледзячы на кулацкую агітацыю, далучылася 20 сялянскіх двароў ваколічных вёсак.

* * *

Дзень такі добры. Комунары з чырвонаармейцамі рыхтуюць сані, запрагаюць коняй. У лес паедуць. А ў агульным памяшканьні комуны чырвонаармейскія брыгады працуюць. Сваёй дружнай работай яны паставілі на ногі комунараў. Брыгады краўцоў шыюць вопратку для комунараў, сталяры і плотнікі вокны і дзьверы папраўляюць, тры чырвонаар-

мейцы цэмэнтавую падлогу кладуць у кухні. Шаўцы—абутак ладзяць, а ротны цырульнік астрыгае кудлатыя валасы з галоў комунараў.

Паехалі. Па дарозе ў Астрашыцкі Гарадок мы спыніліся ў вёсцы Мачаны. На тым баку невялічкай рэчкі раскулачвалі мясцовага кулака. Гэта рабілі мачанцы-колгасьнікі. На днях чырвонаармейцы з удзелам працаўніка сельсавету, правялі тут сход, колгас заснавалі. А сёньня „вызвалялі" кулака ад зямлі і маемасьці, каб у кулацкіх пунях і хлявох, пабудаваных батракамі і беднатой, паставіць аграмаджаную жывёлу колгасьнікаў, а ў клецях ссыпаць збожжа. Усё гэта рабілася для таго, каб замест кулацкай гаспадаркі ўзрастала новая соцыялістычная гаспадарка—колгас.

## Зноў у казармы

Прамова, вырашыўшая лёс існаваньня колгасу, была кароткай. Цяжка было ўтрымаць некаторых сялян-сераднякоў

вёскі Новасёлкі ў колгасе. Падбухтораныя кулакамі, яны хацелі выйсьці з нядаўна заснаванага колгасу.

— Жонкі ня хочуць, каб мы былі ў колгасе.

— Жонкі... Вось яно што. Ну, добра, скажэце, хлопцы, жонкам аб тым, што ў нас цяпер ідзе сход, хай прыдуць і яны,—сказаў старшыня сельсавету камсамольцам.

Сказалі. Зьявіліся і жонкі. Сабраліся. Байчэйшыя бабы наперадзе сталі, другія—ззаду, у куточку. Пачалося з простага, звычайнага. Пачалі самі колгасьнікі.

— Колгас заснаваць заснавалі, а даць грошы і тавары, што мы прасілі, адмовіліся,—сказаў, не паднімаючы галавы, колгасьнік Махавік.

— Дый канюшыны не даюць,—падхапіў Зялёнка.

— Саломы не хапае.

— Насеньня мала.

— Не абсеемся.

— Галоднымі будзем.

І загулі і загулі. Чым далей, тым гулі ўсё мацней і мацней. Жанчыны крычаць сабе, мужчыны—сабе.

— Выйсьці з колгасу.

Ззаду хтосьці шэпча асьцярожна і хуценька. І раптам голас моцны, гучны:

— Ціт, а Ціт!

Але яго ніхто ня чуў. Сход хваляваўся. Колгасьнікі гутарылі, крычалі. Бабы лепяталі між сабой. Зноў пранёсься той самы моцны, гучны, басісты голас.

— Ціт, ты з кім гутарыш там у кутку?

Дзьве сотні вачэй павярнуліся ў Цітаў бок. Працялі Ціта з ног да галавы.

— Ну, з кім-жа гутарыш?—упарта пытаў голас.—Адказвай сходу.

— З Дзямідам,—адказаў Ціт.

— А хто такі Дзямід, ты ведаеш?

— Кулак.

— А на сходзе ён мае права быць?

— Не.

— Ну, дык адчынеце яму дзьверы.

Дзьверы адчыніліся, а потым зачыніліся. Дзямід быў на дварэ.

Сход настарожыўся. Увага колгасьнікаў і колгасьніц мімаволі накіравалася на стол прэзыдыуму сходу. На ўслон узьлез невялічкі, прысадзісты, з вусамі і без барады старшыня колгасу т. Карбань.

— Архіп, ты казаў у цябе канюшыны няма.

— Вядома, што няма.

— А хто ўчора завёз воз на рынак, у Гарадок?

Колгасьнікі засьмяяліся.

— А ты, Мірон, кажаш, што ў цябе саломы не хапае.

— Як табе сказаць, крыху не хапае.

— А пашто ты ўчора воз кулёў прадаў Моўшы?

Мірон плюнуў.

— Адкуль ён ведае?—пранеслася між колгасьнікаў.

— Што, ты гаспадар над нашым дабром ці што? Прадаем сваё, а хочаце, каб у колгасе былі, забясьпечце нас,— усхадзіліся бабы.

—Забясьпечыць?—гаварыў Карбань.— Што-ж, можна, чаму ня так.

І дадаў:—Хто-ж гэта будзе нас забясьпечваць? Хто? пытаюся я вас. Можа бог, а мо' нашы кулакі, той самы Дзямід, якога мы прагналі са сходу? Не, браткі, не колгасьнікі вы, калі так кажаце. Мірон кажа—саломы няма, няпраўда, ёсьць, але можа здарыцца, што і ня будзе, а каб гэтага ня здарылася, ня трэба саломy прадаваць, ня трэба Мірону добрай саломы ў гной класьці і яе хопіць. Тое самае з насеньнем. Няпраўда, сёлета насеньня ня менш, чым было летась, а тымчасам летась усе абсеяліся.

— Усе.-

— Ну, дык сёлета і пагатове абсеемся. Трэба толькі цяпер ня глуміць збожжа, трэба аграмадзіць насеньне і ўсё іншае, і нам хопіць.

— Яно праўда, за шырока мы пачалі жыць,—пачулася сярод баб.

— Ну, дык давайма, дзядзькі, вырашаць пытаньне канчаткова. Ці мы застаемся ў колгасе і прыступаем да выкананьня ўсіх абавязкаў колгасьнікаў, ці будзем распушчаць наш колгас? Кажу,

што на дапамогу пакуль што спадзявацца няма чаго. Самі мы павінны сябе забясьпечыць, сабраўшы ў адно ўсе тыя сродкі, што ў нас ёсьць.

Цішыня. Думаюць. Дзіцё заплакала. Закурылі.

— Ну, я буду галасаваць.

— Хто за колгас?

Усе. І 37 рук паднялося. 37 гаспадароў! І раптам пяць апусьцілася.

Карбань абвёў сход вачыма. Хтосьці праціскваўся да дзьвярэй. Дзьверы адчыніліся. Скрыпнулі. Усе зьвярнулі ўвагу на дзьверы. Пяць, адзін за адным выходзілі на вуліцу. Гэта былі кулакі. Яны адчулі свой лёс, ім не ўдалося сарваць заснаваньне колгасу. Цяпер ім у вёсцы няма месца. Яны будуць выселены. А ў Навасёлках зацьвіце новая гаспадарка—колгас.

* * *

Астрашыцкі Гарадок—невялікае мястэчка, з электрастанцыяй, дрэваапрацоўчым заводам, вадзяным млыном і

нардомам. Вечарамі на вуліцах сьветла, гарацъ электрычныя ліхтары. Цішыня. Звычайная местачковая цішыня. І вось гэту цішыню раптам скаланула. Штосьці нечаканае, пра што местачковыя жыхары і ня думалі. То была хваля колектывізацыі. З вёсак, хутароў і пасёлкаў яна перакінулася ў мястэчка. І пачала штурмаваць. Перш невялічкія хаткі на краі мястэчка, а потым усё бліжэй і бліжэй да цэнтру, і нарэшце гэта колгасная хваля ахапіла ўсё мястэчка.

Адзін, другі сход. Спрэчкі, сваркі, тлумачэньні, і заснаваўся вялікі інтэрнацыянальны колгас. Саматужнікі—яурэі, батракі і беднякі—татары і беларусы—усе ўвайшлі ў колгас. Дарма бегаў да саматужнікаў-яўрэяў местачковы рабін. Яны яго не паслухаліся. Дарма заклікаў веруючых поп, дарма. Голасу яго ніхто не пачуў. Саматужнікі-яўрэі, беднякі і батракі—беларусы сказалі:

— Наша месца ў колгасе,—і як адзін запісаліся ў вялікі Астрашыцка-Гарадзецкі колгас, налічваючы 250 гаспадарак.

Вось у гэты самы гарачы час і прыехалі чырвонаармейскія часьці. Рады былі колгасьнікі. Разам за работу ўзяліся. Чырвонаармейцы дапамагалі ім насеньне ачысьціць, хлявы, клеці і машыны паправіць. Вельмі дапамаглі чырвонаармейцы. Вельмі... Шчыра дзякавалі чырвонаармейцаў колгасьнікі.

* * *

— Сып, Янка, сып!

— Круці!

— Мацней!

... Збожжа ляцела ў бакі. Гула арфа. Удвох круцілі, утрох падносілі збожжа, чацьвёра насыпалі, пяцёра абмяталі. Работа ішла хутка. Два дні—і 112.000 кілё збожжа ачышчана. Зложана на вазы, падрыхтавана да адпраўкі.

— Васіль, паганяй!

— Куды?

— У Відагоршчы.

— Каму?

— Комуне.

— А гэта?

— У Галецу ды Бычкі.

— Каму?

— Новым колгасам.

Паехалі. Скрыпіць сьнег пад палазамі саней, коні хрыпяць. Чырвонаармейцы ідуць ззаду. Гутараць, закурваюць. Папрацавалі. Дапамаглі колгасам у падрыхтоўцы насеньня да вясны.

— Я вось тут памагаю, а дзесьці на Мазыршчыне маім бацьком гэткія-ж самыя чырвонаармейцы дапамагаюць. Піша стары, што ў колгас запісаўся,—кажа чырвонаармеец Васькін.

— І добра зрабіў,—кажа Голек.

— А ці-ж я кажу, што дрэнна, я яму даўно пісаў, каб ён пісаўся,—кажа далей Васькін.

Вецер зашумеў. Лес паказаўся,—белы, мохам аброслы.

— Паганяй!—гукнуў Васькін пярэднім.

*
* *

Дзед Зьмітрок меў у жыцьці толькі адны валёнкі і яны ўзялі, дый парваліся. Надзене дзед валёнкі, пальцы вон вы-

лазяць. Лапці прымайстраваў на іх, дрэнна выйшла. Паправіць валёнкі—грошай няма. Бядняк. Стаіць дзед на вуліцы Астрашыцкага Гарадка і глядзіць як дзяўчаты з хлопцамі на лыжах езьдзяць, а пальцы яго ног выглядаюць з валёнак.

Супроць дом. Дзьверы адчыніліся. Чырвонаармеец выйшаў. Адзеньне чырвонаармейскае, а фартух шаўца. Нож у руках.

— Дзед!

— Чаго сынку?

— У ногі холадна?

— А нічога, так сабе, прабірае крыху.

— Заходзь да нас, пагрэешся, пакурыш.

— Можна, я чалавек ня горды.

І дзед зайшоў. Сеў. Папрасілі скінуць валёнкі. Скінуў. Адзін з чырвонаармейцаў узяў адзін валёнак, другі—другі, папраўляць пачалі. Глядзіць дзед, вачом не дае веры. А час бяжыць. З поўгадзіны—і валёнкі гатовы. Рады дзед. Пайшоў.

А праз дваццаць хвілін зноў зьявіўся. Паглядзеў вакол. Паглядзеў на чырвона-

армейцаў. Хвіліна. Руку пад кажух засунуў, поўлітроўку дастаў:

— Наша—сялянская. З ягадкамі. Выпіце, дзеткі, гэта вам за работу.

Сьмяюцца чырвонаармейцы.

— А ці ня кулак ты, дзедку?

— Дзе там кулак, які з мяне кулак. Кароўка адна. Зямелькі няма. Жонкі няма, а наогул—нічога няма. Двары мяту, мётлы з памёламі вяжу, так і жыву. А цяпер у колгас прынялі.

— Ну, гэта добра, дзедку. Толькі мы піць ня будзем. Ня п'ем.

— Праўда?

— Праўда.

Дзьверы адчыніліся, штосьці зазьвінела. Пачуўся звон шкла. Гэта дзед выкінуў бутэльку з гарэлкай.

— Ня піў і піць ня буду.

— А дзе-ж ты, дзедку, яе ўзяў?

— Даўно купіў, дзеткі. Ды ўсё трымаў для добрых людзей, або для сьвята вялікага, але-ж хто лепшы ёсьць за вас? Вось і прынёс вам. А вы ня хочаце, ну дык туды ёй і дарога.

Чырвонаармейцы рагаталі, частуючы дзеда тытуном.

* * *

У памяшканьні былога заежджага двара чырвонаармейцы рабілі ясьлі. Гэблікі стругаюць, сыплюцца стружкі, хваёвыя, яловыя, мяккія, белыя. Кончылі чырвонаармейцы рабіць ясьлі, за падлогу ўзяліся, поўдня патрацілі на гэту работу. Хлеў прывялі да парадку, паглядзець прыемна. Перакінуліся ў школу. Парты, дошкі, сталы, усё адрамантавалі.

Сход. Дзеці колгасьнікаў, поўныя бадзёрасьці, дзякуюць чырвонаармейцам. А чырвонаармейцы, задаволеныя сваімі посьпехамі, сьмяюцца, ґуляюць з дзяцьмі, вінтоўку разьбіраць вучаць.

— Мала вы ў нас пабылі,—кажуць дзеці.

— А мы яшчэ прыедзем, вясной, калі ў вас вучэньня ня будзе, калі вам вальней крыху будзе, цёпла будзе, страляць навучым.

— Прыяжджайце, рады будзем.

Увечары чырвонаармейцы пайшлі з школы. Не хацелася, але трэба. Хацелася папрацаваць больш, толькі трэба ў казармы. Трэба за навуку брацца, зноў, за баявую.

Заўтра—паход. А сёньня ў штабе—паседжаньне. Разгляд і азнаямленьне са сводкамі з фронту аграпаходу.

Два дні, а зроблена шмат. Многа ў чым памаглі колгасам і колгасьнікам.

Машыны старых колгасаў адрамантаваны. Пуні, хлявы, клеці колгасьнікаў прыведзены да парадку.

Два дні, і за гэтыя два дні адны толькі часьці Менскага гарнізону Беларускай стралковай дывізіі правялі вялікую работу. За час паходу раёны, куды выходзілі часьці дывізіі, зрабіліся раёнамі суцэльнай колектывізацыі. Пры ўдзеле мясцовых організацый чырвонаармейскія часьці заснавалі 6 новых колгасаў і аформілі пяць заснаваных. Аграмадзілі 164.688 кілё насеньня, ачысьцілі 114.368 кілё збожжа. Работа вялікая. Карысная практычная дапамога колгасам.

Заўтра зноў у казармы, а сёньня чырвонаармейцы на вечары ў нардоме Астрашыцкага Гарадка. Ім выносяць падзяку колгасьнікі, іх вітае беднае насельніцтва за іх работу, за організавасьць у рабоце. Іх вітае райком партыі, дзякуюць іх за практычную дапамогу ў соцыялістычнай перабудове вёскі, за дапамогу ў ператварэньні дробнабуржуазнай, лапцюжнай вёскі ў колгасную, комуністычную.

---

З Ь М Е С Т


| | |
|---|---|
| | Стар. |
| Колёны ідуць . . . . . | 3 |
| Старшыня спалохаўся . . . . | 5 |
| Змаганьне за колгас . . . . | 9 |
| Відагоршчы . . . . . | 19 |
| Зноў у казармы . . . . . | 25 |

B00000003 12 1799

1994 г.